**ГУРТОК ВЫРАЗНАГА ЧЫТАННЯ**. Асноўны змест працы гуртка выразнага чытання – навучанне школьнікаў майстэрству чытання спецыяльна падабраных для выканання твораў. Падрыхтоўка дя выканання праходзіць у два этапы: аналіз твора і ўвасабленне твора ў жывым слове. У час заняткаў у гуртку выразнага чытання ў вучняў выпрацоўваюцца ўменні і навыкі ўяўлення, назіральнасці, уменні ўздзейнічаць словам. Вучні таксама займаюцца тэхнікай мовы (развіццё рэберна-дыяфрагматычнага дыхання, выпрацоўка дакладнай дыкцыі).

На занятках гуртка выразнага чытання значнае месца адводзіцца абмекаванню выканання на розных этапах яго падрыхтоўкі. Вучні павінны навучыцца слухаць чытальніка, бачыць станоўчае і недахопы ў яго выкананні, выпрацаваць правільны крытэрый ацэнкі якасці чытання.

У гуртку выразнага чытання спалучаюцца індывідуальныя і калектыўныя формы працы. Кожны гуртковец працуе над асобным творам, а да аналізу гэтага твора далучаюцца ўсе астатнія гурткоўцы. Заняткі па тэхніцы мовы праводзяцца калектыўна, але магчыма і індывідуальная праца, звязаная з выпраўленнем недахопаў мовы асобных вучняў. Паралельна з індывідуальнай працай над выкананнем выкарыстоўваецца ў гуртку і такая форма, як харавое чытанне. Заняткі ў гуртку выразнага чытання цесна звязаны з працай на ўроку літаратуры. З гэтай мэтай у гуртку працуюць не толькі з творамі, выбранымі настаўнікам і вучнямі, але і з творміі, вызначанымі праграмай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ